

Па гарызанталі: **5.** Паўднёваамерыканскі трохпальцы страус. **6.** Рэдкая сятчатая тканіна, баваўняная або льняная, якая служыць асновай пры вышыванні крыжам. **8.** Паселішча на Каўказе і ў Сярэдняй Азіі. **11.** Адзінка даўжыні, роўная 1000 метрам. **12.** Пляцоўка для стаянкі, узлёту, пасадкі і абслугоўвання лятальных апаратаў. **13.** Плеценая з лазы, карэння і інш. круглая пасудзіна для складання і пераноскі чаго-н. **14.** Прадукт працы, выраблены на продаж. **15.** Край, паласа зямлі каля вадаёма. **18.** Падатак у Рускай дзяржаве, які збіралі на карысць казны з народаў Паволжа і Сібіры. **19.** Нізкі дзіцячы або жаночы голас. **21.** Дугападобнае перакрыцце праёма ў сцяне (акна, дзвярэй) або пралёта паміж дзвюма апорамі — слупамі, устоямі моста і інш. **23.** Прадмет або дэталь якой-н. машыны, прыстасавання ў выглядзе плоскага круга. **27.** Мазь для чысткі скуранога абутку. **28.** Сукупнасць строга акрэсленых дзеянняў, якімі суправаджаецца выкананне рэлігійных рытуалаў або бытавых традыцый. **31.** Пасудзіна цыліндрычнай формы з дужкай, у якой носяць або захоўваюць ваду і іншыя вадкасці. **34.** Прадстаўнік самых вялізных паўзуноў, якія жылі і вымерлі ў мезазойскую эру. **35.** Глядзі фота. **36.** Афіцыйны дакумент; пратакол, запіс аб якім-н. юрыдычным факце. **37.** Старажытная прылада, якой разбівалі крапасныя сцены і якая мела выгляд бервяна з металічным наканечнікам, прымацаваным ланцугамі на перасовачнай вежы. **38.** Нябеснае цела, якое па сваёй прыродзе падобна на Сонца і ўяўляецца чалавеку на начным небе ззяючай кропкай.

Па вертыкалі: **1.** Службовая асоба, якая ажыццяўляе натарыяльныя дзеянні. **2.** Груз, падвешаны на шнуры або нітцы для вызначэння вертыкальнага напрамку. **3.** Кляймо на скуры ці на рагах сельскагаспадарчых жывёл як распазнавальны знак. **4.** Двухкрылае насякомае, лічынкі якога паразітуюць у целе жывёл. **7.** Паўночнаамерыканскі дзікі бык атрада парнакапытных з доўгай поўсцю. **8.** Шчыпковы музычны інструмент у выглядзе вялікай трохвугольнай рамы з нацягнутымі на ёй струнамі. **9.** Ступня або ўся нага ў некаторых жывёл і птушак. **10.** Чалавек, які дае сваю кроў для пераліванння хворым. **16.** Нацягнутая на раму белая тканіна для дэманстрацыя фільмаў. **17.** Група злачынцаў, разбойнікаў. **18.** Прыроднае або выкапанае паглыбленне ў зямлі. **20.** Рух электрычнага зараду ў праваднику. **22.** Добра абсталяваная сталовая (звычайна з музыкай, танцамі), дзе можна заказаць дарагія стравы, закускі, напіткі, віно. **24.** Крышталік снегу ў выглядзе зорачкі. **25.** Пачастунак пасля куплі-продажу, заключэння здзелкі. **26.** Верхняя галіністая частка дрэва. **29.** Вецер вялікай разбуральнай сілы, звычайна з дажджом або снегам. **30.** Цвёрды мінерал, які складаецца са слаёў рознай афарбоўкі; выкарыстоўваецца для ўпрыгожанняў і дробных вырабаў. **32.** Драпежная млекакормячая жывёліна сямейства сабачых, якая харчуецца пераважна мярцвячынай. **33.** Нахіл галавы ў знак прывітання.

Склаў Юрый ФАЛІНСКІ,
г. Мінск.

ПРАВЕРЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, АДКАЗЫ

Па гарызанталі: **5.** Наандэ. **6.** Канва. **8.** Аул. **11.** Кіламетр. **12.** Аэрадром. **13.** Кошык. **14.** Тавар. **15.** Берег. **18.** Ясак. **19.** Альт. **21.** Арка. **23.** Дыск. **27.** Вакса. **28.** Абрад. **31.** Вядро. **34.** Дыназаўр. **35.** Афіцыянт. **36.** Акт. **37.** Таран. **38.** Зорка.
Па вертыкалі: **1.** Натарыус. **2.** Адвес. **3.** Таўро. **4.** Авадзень. **7.** Бізон. **8.** Арфа. **9.** Лапа. **10.** Донар. **16.** Экран. **17.** Банда. **18.** Рма. **20.** Ток. **22.** Рэстаран. **24.** Снажынка. **25.** Барыш. **26.** Крона. **29.** Буря. **30.** Агат. **32.** Шакал. **33.** Ківок.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.08	16.50	7.42
Віцебск —	9.05	16.33	7.28
Магілёў —	8.58	16.40	7.42
Гомель —	8.47	16.45	7.58
Гродна —	9.22	17.07	7.45
Брэст —	9.15	17.16	8.01

Месяц

Маладзік 29.11—06.12.
Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Ганны, Таццяны, Аляксандра, Аляксея, Анатоля, Івана, Рыгора, Уладзіміра.*
К. *Клаўдзіі, Францішка.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

— Я быў у некалькіх урачоў, і ні адзін не згодны з вашым дыягназам.

— Ну што ж, пачакаем ускрыцця.

— Як зрабіць дзяўчыну шчаслівай?

— Трэба з ёй ажаніцца.

— Ну не да такой жа ступені.

Дыялог у сеціве.

— Ты што, пакрыўдзілася?

— (Піша... піша... піша... піша... піша... піша... піша...) Не.

Малако, настоенае на селядцы, чысціць там, дзе «Актывія» не дастане.

— Тата, а што такое мафія?

— Гэта нядобрыя людзі, якія прымушаюць цябе паводзіць сябе ціха, а калі ты не падпарадкоўваешся, яны цябе караюць.

— Настаўнікі, ці што?

Малюнак Аляксандра КАРШАКЕВІЧА.

Даты Падзеі Людзі

3 СНЕЖНЯ

1872 год — супрацоўнік Брытанскага музея Джордж Сміт, гравёр па медзі і ўнікальны знаўца асірыйскага клінапісу, выступіў на пасяджэнні Лонданскага таварыства біблейскай археалогіі з сенсацыйным паведамленнем. У выніку расшыфроўкі гліняных клінапісных таблічак, знойдзеных пры раскопках старажытнага горада Нінэвіі, на абломку адной з іх яму ўдалося прачытаць урывак з шумерскага эпасу (3 тысячы гадоў да н. э.) аб Гільгамешы, у якім расказвалася пра пачатак легенды аб Сусветным патопе. Тэкстава ён быў блізкі да біблейскай, але старэйшы за яе на 700 гадоў!

1886 год — 130 гадоў таму нарадзіўся Іван Якаўлевіч Алібегаў, дзяржаўны і палітычны дзеяч Беларусі. З 1915 года жыў у Мінску, ствараў бальшавіцкія арганізацыі ў войсках Заходняга фронту. Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 года — член выканкама Мінскага Савета, з верасня 1917-га — старшыня Мінскага камітэта РСДРП (б). З лістапада 1917 года — камісар працы Заходняй вобласці. У 1918-м быў адным з кіраўнікоў камуністычнага падполля на тэрыторыі Беларусі, акупіраванай нямецкімі войскамі. Загінуў у 1941 годзе ў баі пад Вязьмай.

1902 год — нарадзіўся (г. Віцебск) Іван Іванавіч Салярцінскі, музыказнаўца, літаратурны і тэатральны крытык. У 1924 годзе скончыў Ленінградскі ўніверсітэт. З 1929 года працаваў у Ленінградскай філармоніі (быў яе мастацкім кіраўніком), з 1936-га — адначасова ў Ленінградскай кансерваторыі. Выступаў як лектар і крытык-публіцыст па пытаннях мастацтва, эстэтыкі, псіхалогіі. Унёс значны ўклад у распрацоўку праблем класічнай музычнай спадчыны, опернай і балетнай драматургіі. Памёр ў 1944 годзе.

1921 год — у Мінску створана Беларуская рэспубліканская кантора Дзяржбанка РСФСР (з 1991 года — Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь).

1966 год — у азнаменаванне 25-годдзя разгрому фашысцкіх войск пад Масквой, каля сцен Крамля, у Аляксандраўскім садзе, былі пахаваныя астанкі невядомага салдата, які загінуў смерцю храбрых пры абароне савецкай сталіцы. Да таго прах героя знаходзіўся ў брацкай магіле савецкіх воінаў на 41-м кіламетры ад Масквы па Ленінградскай шашы. На помніку выбіты надпіс: «Імя тваё невядома — подзвіг твой бессмяротны».

Было сказана

Анатоль КУДРАВЕЦ, паэт:
«Цяжка сваімі рукамі звязваць крылле сваёй душы».

■ Будзь у курсе!

НА СВЯТА — У «НАВАГОДНІМ ЭКСПРЭСЕ»

З 24 снежня па 8 студзеня па Дзіцячай чыгунцы імя Канстанціна Заслонава будзе курсіраваць святочны цягнік «Навагодні экспрэс».

У сёлетнім святочным сезоне Дзіцячая чыгунка сумесна з Мінскім Палацам культуры і спорту чыгуначнікаў на станцыі Сасновы Бор арганізуе тэатралізаванае прадстаўленне «У госці да Дзеда Мароза».

Як расказалі ў прэс-цэнтры Беларускай чыгункі, 24, 25 снежня, 2, 7 і 8 студзеня цягнік будзе вазіць пасажыраў з 10.30 да 16.30; 28, 29, 30 снежня першы цягнік адправіцца са станцыі Заслонава ў 13.00, а апошні — у 16.30, 31 снежня рэжым работы Дзіцячай чыгункі — з 10.30 да 13.30, а 1 студзеня — з 13.30 да 16.30. 5 і 6 студзеня пракаціцца на «Навагоднім экспрэсе» можна будзе з 11.00 да 15.00.

Продаж білетаў на «Навагодні экспрэс» ужо адкрыты. Іх можна набыць на станцыі Заслонава Дзіцячай чыгункі. Кошт складае 15 рублёў.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 284 44 04, падпіскі і распаўсюджвання — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4676. Нумар падпісаны ў 19.30 2 снежня 2016 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12